Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суд прызнаў актывістаў «Сумленнай улады» дробнымі хуліганамі

30.12.2014 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Па 25 базавых велічынь штрафу сябрам ствараната міжнароднага аб'яднаньня «За сумленную ўладу» Пятру Іванову і Аляксандру Холаду і 10 базавых велічынь Пятру Берлінаву – такое рашэньне абвясьціла 23 сьнежня судзьдзя суду Першамайскага раёну Віцебску Натальля Карабліна. Усе трое былі прызнаныя вінаватымі ў парушэньні артыкулу 17.1 КаАП (дробнае хуліганства).

Актывістаў абвінавацілі ў тым, што 5 сьнежня яны нібыта незаконна ўварваліся на ўчастак, дзе стаяў дом Пятра Берлінава, які згодна з рашэньнем мясцовых уладаў падлягаў зносу, зламалі пры гэтым весьнічкі і зьбілі вартаўніка. У якасьці доказу віны абвінавачаных выкарыстоўваўся дыск з відэазапісам і паказаньні сьведак.

Распавядае Пётар Берлінаў: «Зямля знаходзілася ў маім карыстаньні, я прыйшоў на сваю зямлю. «Жылбуд» сваім лістом мяне раней апавясьціў, што я ў любы час магу прыходзіць і забіраць сваю маёмасьць. Але вартаўнік мяне не пускаў. Гэтак было неаднаразова. 5-га чысла я прывёў на ўчастак сваіх знаёмых, каб яны засьведчылі, што чыніцца беззаконьне. Мы нічога неправамернага не зьдзяйсьнялі, парадак не парушалі – мы проста прыйшлі на мой участак. Я адчыніў весьнічкі правільна – унутар, не ламаў іх. А нас абвінавацілі, што мы іх зламалі. Ды напалі на вартаўніка. Хаця гэта ён мне парваў куртку і швэдар, спрабуючы нас не пусьціць».

Галоўным сьведкам на судзе выступаў вартаўнік, нібыта зьбіты актывістамі. Паводле словаў спадара Берлінава, адказы вартаўніка на пытаньні судзьдзі былі супярэчлівымі, ён блытаўся ў сваіх паказаньнях. Вартаўнік сьцьвярджаў, што актывісты зламалі весьнічкі, павалілі яго ды ўтраіх ляжалі на ім. Ніхто зь іншых сьведкаў гэтага не пацьвердзіў.

Што тычыцца астатніх сьведак – двух рабочых «Жылбуду», якія працавалі на ўчастку падчас інцыдэнту, – дык яны спрабавалі казаць праўду. «Сьведкі пацьвердзілі, што мы падышлі, прадставіліся. Хаця вартаўнік казаў, што мы падбеглі, пачалі нагамі біць па брамцы мэталёвай – кажа Берлінаў. – Аднак

судзьдзя Карабліна пачынала задаваць ім навадныя пытаньні, каб у выніку яны блыталіся і сьведчылі супраць нас».

«Напрыклад, заходзіць сьведка. Я і іншыя задаюць яму пытаньне: Ці гучаў з нашага боку мат? Ён: Не, не гучаў. А судзьдзя тады запытваецца: Ці ўсё поўнасьцю, ад пачатку да канца вы чулі, усе размовы? Або, мабыць, нешта маглі ня чуць? То бок судзьдзя наводзіла сьведку на тое, каб ён сказаў, што, маўляў, так, я мог не пачуць нейкіх словаў».

Актывісты ўпэўненыя, што іх пакаралі штрафам незаконна. Найбліжэйшым часам яны зьбіраюцца абскардзіць рашэньне судзьдзі Карабліной у абласным судзе.

"Віцебская Вясна"

Твитнуть









чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску




#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ
Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сход

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў

рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY